# МАШЭРАЎЦЫ ДАПАМАГАЮЦЬ У ЗБОРЫ ЎРАДЖАЮ

***Чаму карысна працаваць фізічна на свежым паветры, якім чынам агульны занятак аб'ядноўвае людзей і, вядома, як адрозніць адзін гатунак яблыкаў ад другога. Усё гэта і не толькі зараз ведаюць тыя студэнты ВДУ, якія гэтай восенню пабывалі на сельскагаспадарчых работах на Талачынскім кансервавым заводзе і Лужаснянскай сортавыпрабавальнай станцыі. Сваімі ўражаннямі машэраўцы падзяліліся з карэспандэнтам газеты «Мы і час».***



**Ілля МАЦЮК, студэнт 2 курса факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый:**

– У Талачын у гэтым годзе я паехаў упершыню і адразу быў прызначаны камандзірам атрада. У мае абавязкі ўваходзіла не толькі збіраць яблыкі, але і пералічваць людзей перад працай і прадастаўляць справаздачу аб адсутных.

Мяне ўсё задаволіла. Кармілі нас тры разы на дзень, а калі ішоў дождж, то выдавалі дажджавікі і гумовыя пальчаткі альбо адвозілі ў нумары. Адзначу, што ўмовы пражывання асабіста для мяне былі нядрэнныя, таму мне няма на што скардзіцца. Жылі мы ў камфартабельнай гасцініцы, дзе весела бавілі вольны час. А самым складаным на сельскагаспадарчых работах для мяне было тое, што наша праца была з большага манатоннай.

У цэлым у мяне засталіся станоўчыя эмоцыі. Лічу, што падобныя заняткі зблiжаюць і даюць магчымасць знайсці новыя знаёмствы.



**Дзіяна ВІКУЛІНА, студэнтка 2 курса юрыдычнага факультэта:**

– Сёлета я ўпершыню пабывала на сельскагаспадарчых работах у Талачыне. Уражанні пасля паездкі засталіся пераважна станоўчыя, хоць былі і моманты, калі вельмі хацелася дадому. Аднак сябры, якія былі побач, дапамагалі аднаўляцца як фізічна, так і маральна.

З некаторымі студэнтамі мы летам разам працавалі на ЗАТ «Атлант» у рамках Моладзевага вытворчага праекта «Атлант-2022». Таму было прыемна сустрэць знаёмых людзей, з якімі мяне ўжо многае звязвала. А гэтая паездка стала дадаткам у нашу агульную скарбонку ўспамінаў.

Падчас працы з намі, вядома ж, здараліся цікавыя і пацешныя гісторыі. Чаго вартыя хаця б нашыя спробы паспаборнічаць з іншымі брыгадамі па колькасці сабраных яблыкаў!

Калі ў наступным годзе будзе магчымасць паехаць у Талачын, ёсць верагоднасць, што я ёю скарыстаюся.

**Аляксандра ДАНІЛАВА, студэнтка 2 курса факультэта фізічнай культуры і спорту:**

– Два тыдні ў Талачыне праляцелі незаўважна. Хаця, прызнаюся, спачатку мне было даволі цяжка ўліцца ў рабочы працэс. Здавалася б, абавязкі ў нас былі не такія ўжо і складаныя: мы павінны былі здымаць яблыкі з дрэў, затым выгружаць сабраны ўраджай у спецыяльныя кантэйнеры. Але на справе аказалася не ўсё так проста. У першую чаргу з-за таго, што падобная фізічная нагрузка для многіх з нас была нязвыклай.

Але гэта дробязі. Галоўнае – мне падабалася рабочая і пры гэтым сяброўская атмасфера ў нашым калектыве. Тое, што мы не толькі разам працавалі,



але і весела праводзілі вольны час: абмяркоўвалі розныя тэмы, жартавалі, гулялі ў нешта.

Адзначу, што ўмовы працы і пражывання ў Талачыне былі добрыя. Магчыма, я б была не супраць вярнуцца сюды ў наступным годзе, каб знайсці новых сяброў і зарабіць грошы.

**Яна МАЦВЕЕВА, студэнтка 2 курса факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі:**

– З'ездзіць на сельскагаспадарчыя работы ў Талачын – гэта выдатная магчымасць не толькі зарабіць грошы, але і назапасіцца вітамінамі на цэлы год.

Лічу, што ўмовы для працы і пражывання былі на вышэйшым узроўні. Нас даволі смачна кармілі тры разы на дзень, а таксама выдавалі пальчаткі і дажджавікі, калі гэта было патрэбна.

Што для мяне было цяжкім, так гэта тое, што кожны дзень прыходзілася рабіць адно і тое ж. Выратоўвалі па-сапраўднаму сяброўская атмасфера і надзейныя людзі побач.

Сёння ў думках я даволі часта вяртаюся ў Талачын і ўсміхаюся, калі ўспамінаю, напрыклад, як кіроўца машыны, калі вёз нас на работу ці з работы, уключаў шансон, і мы ўсе разам гучна спявалі.



Думаю, што ў наступным годзе прыеду сюды зноў, каб акунуцца ў гэтую непаўторную атмасферу.



**Аляксей ЯКАЎЛЕЎ, майстар вытворчага навучання мастацка-графічнага факультэта:**

– Сельскагаспадарчыя работы для мяне – не навінка. Памятаю, што ў студэнцкія гады я рэгулярна ездзіў збіраць ураджай яблыкаў, бульбы і ільну. Гэтай жа восенню я адправіўся ў Талачын разам са студэнтамі факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі, педагагічнага факультэта і факультэта гуманітарыстыкі і моўных камунікацый. Лічу, што машэраўцы – малайцы. Асобна хацелася б адзначыць прадстаўнікоў факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі, якія заўсёды сумленна падыходзілі да выканання сваёй працы і, думаю, зарабілі нядрэнныя грошы.

Мне здаецца, што паездкі на сельскагаспадарчыя работы студэнтам патрэбныя, бо яны дапамагаюць прывіць любоў да фізічнай працы і пакідаюць пасля сябе шмат сумесных прыемных успамінаў.

Менавіта ў Талачыне я зразумеў, што машэраўцы – вялікая і дружная сям'я, якая працуе і адпачывае разам.

**P.S.** У гэтым годзе ў зборы ўраджаю яблыкаў на працягу верасня – кастрычніка былі задзейнічаны больш за 230 студэнтаў – прадстаўнікоў усіх факультэтаў нашага ўніверсітэта.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**

**Фотаздымкі з архіваў рэспандэнтаў.**